

Коцік-варкоцік
Лёг на жывоцік,
Лапкі пад вушка -
Не трэба падушка.



Ён сваволіць, брэша, скача,
Даганяе пругкі мячык
І хапае костку з рук.
Ён у хату не пускае,
Дзверы лапай зачыняе,
Ён заўжды са мной гуляе -
Жучка, лепшы мой сябрук.



Я пасу авечкі
Каля самай рэчкі.
Воўна ў іх бялюткая,
Мяккая, танюткая.

Будзе на валёнкі,
Будзе на панчошкі
І на рукавічкі
Застанецца трошкі.



- Куркі, куркі!
- Ко-ка? Ко-ка?
- Не хадзеце ў лес далёка,
Бо гуляе ў лесе ліс,
Шмат ён курачак загрыз.



Гаманліваю гурмою
Гусі гоняцца за мною.
- Гусі, гусі!
- Га-га-га!
- Даць гароху вам?
- Ага!



- Што такое? Што такое? -
Крэкча качка раніцою. -
Сьнег палёг на паплавы,
Не відаць нідзе травы.



Ох і цяжкая работа -
Маляванне бегемота:
Ён з вялізным жыватом
Не ўмяшчаецца ў альбом!